# Дэзінфармацыйныя наратывы пра **Усходняе партнёрства**

EU VS DiSiNFO

Усходняе партнёрства (УП), якое пачало працаваць у 2009 годзе, накіравана на паглыбленне і ўмацаванне адносін паміж Еўрапейскім саюзам (ЕС), яго дзяржавамі-членамі і шасцю ўсходнімі суседзямі: Арменіяй, Азербайджанам, Беларуссю, Грузіяй, Рэспублікай Малдова і Украінай.

Усходняе партнёрства і яго ўдзельнікі з'яўляюцца аб'ектамі дэзынфармацыйных кампаній, якія пазбаўляюць грамадзян дакладнай і праверанай інфармацыі аб ініцыятыве і яе перавагах. Найбольш распаўсюджаныя дэзынфармацыйныя наратывы ўсяляюць страх і імкнуцца пераканаць, што грамадзяне краін Усходняга партнёрства не маюць выбару перад сваімі рашэннямі.

## НЕ ПАДМАНВАЙЦЕСЯ! БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ!

Вось найбольш распаўсюджаныя дэзынфармацыйныя наратывы пра Усходняе партнёрства.

**ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ**

### Усходняе партнёрства навязваецца партнёрам супраць іх волі

**АБВЯРЖЭННЕ**

"Усходняе партнёрства" — гэта сумесная ініцыятыва Еўрапейскага саюза, яго дзяржаў-членаў і краін-партнёраў. У краін-партнёраў ёсць выбар адносна ўзроўню ўдзелу і амбіцый. **Краіны-партнёры вырашаюць, ці варта ім забяспечваць адпаведнасць са стандартамі ЕС**. Гэта робіцца, напрыклад, шляхам укаранення празрыстых і падсправаздачных структур кіравання і гарманізацыі галіновых стандартаў, каб скарыстацца гандлёвымі магчымасцямі паміж краінамі УП і ЕС.

**ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ**

### Усходняе партнёрства было распрацавана ЕС для кантролю над сваімі партнёрамі

**АБВЯРЖЭННЕ**

Усходняе партнёрства з'яўляецца сумесней ініцыятывай, якая накіравана на ўмацаванне адносін паміж краінамі-членамі Еўрапейскага саюза і яго ўсходнімі суседзямі. Ініцыятыва „Усходняе партнёрства" з'яўляецца пляцоўкай для краін рэгіёну, прызначанай для пабудовы больш цесных адносін з ЕС, **калі яны вырашылі гэта рабіць**. Усходняе партнёрства выступае за добрасуседскія адносіны і паважае індывідуальныя памкненні і амбіцыі кожнай краіны-партнёра. Аснова Усходняга партнёрства – інвестыцыі ў рэформы і павага да агульных фундаментальных каштоўнасцяў. Гэта ўключае ў сябе падтрымку дэмакратыі, правоў чалавека, рэформаў прававых нормаў, падтрымку барацьбы з карупцыяй, гендарнай роўнасці, грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ.

#StrongerTogether
www.euvsdisinfo.eu

EaP Eastern Partnership

Снежань 2021 года

# Дэзінфармацыйныя наратывы пра Усходняе партнёрства

EU VS DiSiNFO

ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ

## Сяброўства ва Усходнім партнёрстве ставіць пад пагрозу традыцыйныя каштоўнасці і нацыянальную ідэнтычнасць

АБВЯРЖЭННЕ

Усходняе партнёрства — гэта стратэгічнае і амбіцыйнае партнёрства, заснаванае на агульных каштоўнасцях і правілах, узаемных інтарэсах і абавязацельствах, а таксама на сумеснай уласнасці і адказнасці. Далейшае выкананне парадку дня рэформ, а таксама павага да фундаментальных і агульных каштоўнасцяў з'яўляюцца і застануцца асновай нашага партнёрства. Усходняе партнёрства накіравана на ўмацаванне палітычных сувязяў і эканамічнай інтэграцыі краін-партнёраў. Такое партнёрства не скіравана супраць ідэнтычнасці якой бы то ні было краіны. ЕС **прасоўвае ключавую ролю культуры ў пабудове адкрытасці і садзейнічанні міжкультурнаму дыялогу** для мірных адносін паміж супольнасцямі. ЕС падтрымлівае ўдзел моладзі і грамадзянскай супольнасці ў дэмакратычных працэсах і прыслухоўваецца да іх галасоў.

ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ

## Усходняе партнёрства з'яўляецца інструментам дэстабілізацыі і давядзення да рэвалюцыі

АБВЯРЖЭННЕ

Парадак дня Усходняга партнёрства скіраваны на пазітыўныя змены ў жыцці людзей з Еўрапейскага саюза і краін Усходняга партнёрства. Адным з ключавых спосабаў дасягнуць гэтага з'яўляецца заахвочванне дэмакратычных правілаў і прынцыпаў, павагі да агульных фундаментальных каштоўнасцяў і інвеставання ў рэформы. Гэта ўключае ў сябе падтрымку рэформаў прававых нормаў, барацьбу з карупцыяй, парушэннем гендарнай роўнасці, а таксама падтрымку грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ. ЕС не навязвае краінам-партнёрам ніякіх дзеянняў і праграм. Агульная мэта супрацоўніцтва **заключаецца ў тым, каб пабудаваць агульную зону дэмакратыі, дабрабыту і стабільнасці** ў адпаведнасці з памкненнямі кожнай асобнай краіны.

ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ

## Краіны Усходняга партнёрства вымушаны купляць вакцыны заходняй вытворчасці, і ім забаронена набываць расейскія вакцыны

АБВЯРЖЭННЕ

Краіны УП **вольныя** ў тым, каб набываць любую вакцыну. Пяцёра з іх удзельнічаюць у **COVAX Facility** і атрымалі вакцыны непасрэдна з краін-членаў ЕС або праз COVAX. Акрамя таго, УП змагаецца з пандэміяй COVID-19 праз спецыяльныя праграмы дапамогі разам з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі і ў супрацоўніцтве з дзяржавамі-членамі ЕС у рамках падыходу Каманда Еўропы.

ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ

## „Усходняе партнёрства" — антырасейскі праект

АБВЯРЖЭННЕ

Усходняе партнёрства **не накіравана супраць якой-небудзь краіны;** гэта канструктыўная платформа для краін рэгіёна, прызначаная для пабудовы больш цесных адносін з ЕС, калі яны гэтага захочуць. ЕС не ўмешваецца ў знешнепалітычны выбар якой-небудзь краіны і не патрабуе ад сваіх партнёраў выбару паміж ЕС і любой іншай краінай.

#StrongerTogether
www.euvsdisinfo.eu

EaP Eastern Partnership

Снежань 2021 года